**Творчасць.** Кніжна-ілюстрацыйная выстаўка «Анатомія дызайну» адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Яна дапаможа наведвальнікам спазнаць логіку развіцця дызайну, адчуць складанасці адносін майстроў з грамадствам і светам, зразумець прычынна-выніковую сувязь прыняцця тых ці іншых рашэнняў, запэўнілі ў НББ. Экспазіцыя адлюстроўвае аўтарскія канцэпцыі аб актуальных тэндэнцыях і перспектывах сучаснага графічнага дызайну. Акцэнт зроблены на падрыхтоўцы спецыялістаў для работы ў электронным асяроддзі — разглядаюцца новыя тэхналогіі стварэння візуальных, медыйных і графічных прадуктаў. Запатрабаваныя і актуальныя кнігі выдавецтва знакамітай студыі Арцемія Лебедзева. Дэманструюцца выданні аўтараў з сусветным імем: «Модульныя сістэмы ў графічным дызайне» Ёзэфа Мюлера-Брокмана, «Мастацтва дызайнера» Пола Рэнда, «Новая тыпаграфіка» Яна Чыхальда.